АРК


# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 4(54) 2007

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія


## Змест


**Галоўны рэдактар:**
П. Дз. Кухарчык

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Леваш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Н...
В. М.
А. І. (
В. Д.
В. Б.
А. І.
І. С.
В. М


Весці БДПУ
сер2. н.4. 2007


***Гісторыя***

*Шаўчук І.І.* Дынаміка колькаснага складу аспірантуры па гуманітарных дысцыплінах (20–30-я гг. ХХ ст.) ........ 3

*Здановіч У.В.* Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1990–2005 гг.) ........ 7

*Помазаў С.В.* Сацыяльны і нацыянальны склад навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў БССР у першай палове 1920-х гг. ........ 13

*Мініцкі М.І.* Гістарычныя адукацыйныя веды: роля кагнітыўных практык ........ 18

*Вуглік І.Р.* Сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі беларускага сялянства XVIII ст. ........ 22

*Русецкі С.В.* Вывучэнне традыцый дабрачыннасці ва ўсходніх славян у беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх даследаваннях ХІХ – пачатку ХХІ ст. ........ 25

*Атрушкевіч М.М.* Гільдзейскае заканадаўства ў Беларусі ў 20-я гг. ХІХ ст. ........ 30

*Лаўрыновіч Д.С.* Віленскія акцябрысты і іх саюзнікі ў пачатку ХХ ст. .. 33

*Варабёў А.А.* Да пытання аб выніках выбараў ва Устаноўчы сход у Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні ........ 37

*Крываротт А.А.* Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызан (1941–1944): гістарыяграфія за 1941–1965 гг. ........ 40

*Вялікі А.Ф.* Савецка-польскае Пагадненне аб рэпатрыяцыі ад 25 сакавіка 1957 г. як нарматыўна-прававая база рэпатрыяцыі палякаў з БССР у Польшчу ........ 45

*Папоў М.А.* Дапаможныя біскупы Магілёўскага рымска-каталіцкага архібіскупства ў эпоху мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (1773–1826 гг.) ........ 50

*Скарабагатая І.А.* Нацыянал-сацыялістычны рух у Аўстрыі (1920-я гг.) ........ 55

***Філасофія***

*Кікель П.В.*, *Абалевіч І.В.* Беларускі шлях развіцця: праблемы і перспектывы ........ 60

*Таркан І.І.* Канцэпцыі дыялога культур у рускай філасофскай думцы другой паловы ХХ ст. ........ 63

*Ігнатовіч А.Л.* Неасакратаўская размова ў кантэксце развіцця кагнітыўнай навукі другога пакалення ........ 66

***Паліталогія***

*Сіманоўскі І.С.* Метады экстрапаляцыі і параўнальнага аналізу міжнародных адносін ........ 69


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

УДК [323: 28] (560)

**М.Б. Канапацкі,**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі і права БДПУ*

# ІСЛАМСКІ ФАКТАР У ПАЛІТЫЧНЫМ РАЗВІЦЦІ ТУРЦЫІ

Развіццё сучаснай Еўропы прадугледжвае інтэграцыйныя тэндэнцыі, уніфікацыю палітычнай мадэлі палітычнай сістэмы. Вядучыя еўрапейскія краіны (Францыя, Вялікабрытанія, Германія), хоць і дасягнулі значных поспехаў у эканоміцы, у палітычнай сферы, у той жа час маюць пэўныя праблемы. Мадэрнізацыйны праект стварэння адзінай Еўропы ўплывае на грамадскую свядомасць, на нацыянальныя пачуцці грамадзян адзінай Еўропы. Напрыклад, Францыя, як ніякая іншая, адчувае ўплыў мадэрнізацыйных праектаў, уплыў пэўных грамадскіх сіл, якія дэтэрмінуюць вектар палітычнага развіцця. Папярэднія і цяперашнія прэзідэнцкія выбары, рэферэндум па пытанні прыняцця адзінай еўрапейскай канстытуцыі паказалі, што пэўная частка французскіх грамадзян негатыўна адносіцца да ідэі еўрапейскай інтэграцыі. У Францыі сфарміраваўся ультраправы нацыяналістычны рух, які падтрымліваюць мільёны французаў.

Як вядома, еўрапейскае згуртаванне выпрацавала адзіныя крытэрыі эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага развіцця. Імі кіруецца адзіная Еўропа, і яны прад'яўляюцца да кандыдатаў на ўступленне ў Еўрасаюз.

Адным з патэнцыяльных прэтэндэнтаў на ўступленне ў Еўрасаюз з'яўляецца Турэцкая рэспубліка, палітычная сістэма якой адчувае ўплыў розных фактараў, адным з якіх з'яўляецца іслам. Адзначым, што рэлігійны ісламскі фактар трывожыць аб'яднаную Еўропу. Да таго ж многія краіны сутыкнуліся з праблемай вызначэння ролі і месца рэлігіі ў сістэме грамадства. Паспрабуем абвергнуць думку еўраскептыкаў і пераканаць іх, што ісламскі фактар такі ж традыцыйны, як і нацыянальныя працэсы ў Францыі.

Ісламская рэлігія яшчэ з часоў Асманскай дзяржавы істотна ўплывае на палітычную сістэму грамадства, на развіццё дзяржавы. Традыцыі напаўтэакратычнага грамадства абумоўліваюць развіццё турэцкага грамадства. Гэта разумелі рэфарматары, якія спрабавалі стварыць новую мадэль палітычнага ўпарадкавання. Яны лічылі, што любая іерархія па сваёй сутнасці з'яўляецца свецкай і прадугледжвае змяненне дзяржаўных інстытутаў. Дзяржаўныя чыноўнікі павінны перашкаджаць звароту да законаў шарыяту. Асаблівасць ісламу заключаецца ў тым, што ў ім няма фармальных свяшчэннаслужыцелей. Як адзначае турэцкі даследчык Бахрыйе Ючок, паміж Алахам і чалавекам не можа быць пасрэдніка. Няма ні іерархіі, ні рэлігійнага праўлення. Іслам нікога не абагаўляе. Халіф – гэта пасада, становішча, якое ўзнікае ў выніку палітычнага выбару, валодання рэлігійнымі паўнамоцтвамі [1]. У гэтай сувязі выцясненне рэлігіі са сферы палітыкі ідзе ў разрэз з канцэпцыяй мусульманскіх мысліцелей і, як вынік, правакуе нездавальненне і абурэнне. Мадэрнізацыйны праект спрыяў расколу ў палітычных колах турэцкага грамадства. Турэцкі даследчык Абдэльазіз Шаваш адзначаў, што ліквідацыя халіфату азначае падзенне палітычнага ўплыву на мусульман Азіі і Афрыкі і ў перспектыве рэспубліка будзе вымушана абараняцца, праводзячы палітыку мілітарызму [2].

На думку Рашыда Рыда, ліквідацыя халіфату азначае супрацьпастаўленне *умы нацыі*. А яно непазбежна вядзе да пэўнага становішча ці адмоўнага меркавання. Рыда абгрунтаваў уласную тэорыю рэлігійнага абнаўлення «іджтыхада», якая мае ўласнае тлумачэнне, што дае паглыбленае веданне каранічнай аргументацыі [3]. Іслам забараняе любую родавую ці нацыянальную адасобленасць, паколькі наогул любая адасобленасць раздзяляе абшчыну, падрывае дух адзінства і вернасці традыцыі, выклікае нянавісць там, дзе была згода.

Стварэнне новай мадэлі палітычнай сістэмы і прывядзенне ісламу ў адпаведнасць з ёй звязана з вялікімі цяжкасцямі. Парадаксальна, што чым больш імкненне рэфарматараў да дэмакратыі, тым мацней адчуваўся ўплыў ісламу на палітычную сістэму, палітычнае жыццё. Прэстыж, папулярнасць палітычных партый залежаць ад таго, наколькі і ў якой ступені яны выкарыстоўваюць рэлігійны фактар. Краіна засталася глыбока рэлігійнай, і ўстанаўленне дэмакратыі паставіла пад сумненне рэформы Атацюрка. Сучасныя палітычныя лідэры павінны ўлічваць, што большая частка выбаршчыкаў (сельскія жыхары) пастаянна сімпатызуе ісламу. У выніку гэтага прадстаўнікі мадэрнізацыйнага праекта былі вымушаны ісці на некаторыя ўступкі. Так, лідэр Дэмакратычнай партыі заявіў, што калі народ пажадае, то будзе адноўлены халіфат [4].

Імкненне дэзавуіраваць некаторыя атэістычныя праекты і заручыцца падтрымкай турэцкага электарату прывяло да актывізацыі ісламісцкіх сіл. Некаторыя турэцкія даследчыкі адзначаюць, што непаслядоўная палітыка дэмакратаў прывяла да дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лібералізм прывёў да анархіі і тэрарызму, да негатыўных наступстваў грамадскага развіцця. Усхваляючы рэлігійныя пачуцці народных мас, улады спрыялі легалізацыі рэлігіі. Яны садзейнічалі легалізацыі рэлігійнай адукацыі ў школах, імкліваму росту колькасці каранічных школ. Тэндэнцыя выконваць пажаданні народа спрыяла парытэту прагрэсу і рэлігіі. Першы этап дэмакратычных пераўтварэнняў скончыўся няўдачай. Дэмакратыю немагчыма было ўстанавіць у краіне, дзе большасць насельніцтва пражывала ў замкнутым асяроддзі. Дэмакратыя ў Турцыі характарызавалася рэжымам асабістай улады кіраўніка дзяржавы. Народ як глядач прысутнічаў і прысутнічае намінальна ў палітыцы і не праяўляе асаблівай увагі да такіх дэмакратычных каштоўнасцей, як свабода прэсы і свабода асобы. Гэтыя дэмакратычныя каштоўнасці яму часам незразумелыя. Улічваючы гэта, турэцкія ваенныя імкнуцца праводзіць гібкую тактыку ў адносінах да ісламскай рэлігіі. Прытрымліваючыся прынцыпаў лаіцызму, яны сфармулявалі тры напрамкі: падкрэсленыя адносіны да рэлігіі антыклерыкалізм, туркізм. Як мы ўжо адзначалі вышэй, палітычная дзейнасць сучасных палітычных партый апасродкавана ісламскім фактарам. З пачатку 70-х гг. мінулага стагоддзя актыўную ролю пачынае адыгрываць Партыя справядлівасці. Умела падладжваючыся пад праісламскі электарат, партыя атрымлівае яго значную падтрымку і блізкіх яму па ідэалогіі. Уплыў і папулярнасць дазволілі Партыі справядлівасці ўступіць у кааліцыю з кемалісцкай Народна-Рэспубліканскай партыяй і Партыяй нацыянальнага выратавання.

Яна здолела дабіцца значных уступак ад НРП. У прыватнасці, у пачатковай і сярэдняй школе былі ўведзены заняткі па «нацыянальнай маральнасці», адкрыты навучальныя ўстановы па падрыхтоўцы ісламскіх прапаведнікаў, дазволены доступ іх выпускнікоў ва універсітэты.

Гэтыя ўступкі нанеслі сур'ёзны ўдар па кемалісцкім прынцыпе лаіцызму. Палітыка лавіравання, падладжвання да электарату дазволіла партыям пераадолець ідэалагічны антаганізм і стварыць у сярэдзіне 70-х гг. кааліцыю. Гэта кааліцыя, на думку турэцкага аўтара Сонера Ялчына, уяўляла турэцка-ісламскі сінтэз. Лідэр Партыі нацыянальнага выратавання Эрбакан не скрываў праісламскую арыентацыю. У якасці прыкладу можна прывесці партыйныя лозунгі «іслам або смерць», «шарыят будзе адноўлены ў Турцыі» [5].

На розных этапах працэсу мадэрнізацыі супрацьстаянне ісламу і палітыкі складвалася па-рознаму. Калі на пачатковым этапе станаўлення свецкай дзяржавы кемалізм дамінаваў у адносінах да ісламу, то к сярэдзіне 80-х гг. іслам зрабіў уплыў на дзяржаўную ідэалогію. Іслам становіцца праціўнікам палітычнай улады. Праісламскія палітычныя партыі, выкарыстоўваючы дэмакратычную і нацыяналістычную сістэму і ідэю турэцка-ісламскага сінтэзу, атрымліваюць магчымасць уплываць на ход палітычнага развіцця.

Спробы ствараць мадэль свецкай дзяржавы па ўзоры французскай не ўвянчаліся поспехам. Гэта мадэль з'яўляецца не вынікам ліберальных і дэмакратычных настрояў большасці грамадства, а імкненнем самаарганізоўвацца па-за дзяржавай, каб прыйсці да ўлады. Знешні фактар уплыву ісламскага свету ў Еўропе пры дапамозе шматлікай дыяспары з'яўляецца своеасаблівым каталізатарам палітычнага працэсу. Палітычныя партыі пачынаюць узаемадзейнічаць з рознымі праісламскімі арганізацыямі. Напрыклад, Партыя нацыянальнага выратавання наладзіла цеснае супрацоўніцтва з ісламскімі арганізацыямі Саудаўскай Аравіі. У пачатку 80-х гг. у Стамбуле адкрываецца Цэнтр даследаванняў па ісламскай гісторыі, мастацтве і культуры.

У грамадскай свядомасці ідзе пераасэнсаванне прынцыпу нацыяналізму. Узмацняецца жаданне прымірыць іслам і цюркі. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што гэтыя дзве якасці могуць гарманічна спалучацца адна з адной. Ідэалогія парытэту становіцца здабыткам праграм палітычных партый.

Напрыклад, Партыя працвітання ў палітычнай праграме фармулюе канцэпцыю справядлівасці першапачатковага ісламу. Яна дэкларуе неабходнасць стварэння эканомкі, якая прадугледжвала б ліквідацыю несправядлівых умоў прадастаўлення пазык пад працэнты, справядлівае прадастаўленне крэдытаў і г. д. Кемалісцкі прынцып «суверэнітэту народа» падмяняецца боскім суверэнітэтам, які выключае стварэнне чалавечых інстытутаў за межамі слова Божага.

Партыя працвітання апелюе да дэмакратыі, імкнецца ўстанавіць нормы шарыяту дэмакратычным шляхам. Для таго каб аспрэчыць канцэпцыю нацыянальнага суверэнітэту, выкарыстоўваюць прыклады развіцця іншых дзяржаў. Адзін з лідэраў Партыі нацыянальнага вызвалення Шэўкет Казал заяўляе, што прэзідэнт Злучаных Штатаў прыносіць клятву на Біблії, у той жа час як прэзідэнт Турцыі, насельніцтва якой у большасці сваёй мусульмане, не можа прынесці клятву на Каране [6]. Такія разважанні выклікаюць станоўчую рэакцыю ў шырокіх слаях турэцкага грамадства. Ісламскія партыі спрабуюць дэзавуіраваць прынцып лаіцызму і змяніць палажэнні канстытуцыі, якія абвяшчаюць Турцыю свецкай дзяржавай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ёсць усе падставы меркаваць, што мадэрнізацыйны праект стварэння свецкай дзяржавы перайшоў у іншую стадыю. Для гэтай стадыі характэрна супрацьстаянне палітычных партый кірамісцкай і ісламскай арыентацыі. Яно праяўляецца ў імкненні лавіравання, рэагавання на палітычныя змяненні. Гэтыя змяненні апасродкаваны пачуццямі турэцкага электарату. Фактар знешняга ўплыву з боку Усходу і Захаду з'яўляецца толькі каталізатарам палітычнага працэсу. Напрыклад, курдская праблема, прызнанне генацыду армян правакуе экстрэмісцкія сілы, уносіць сумятню ў палітычнае жыццё. Бясспрэчна тое, што рэалізацыя кемалісцкіх прынцыпаў спрыяла ўстанаўленню дэмакратыі, актывізацыі палітычнага жыцця. У той жа час спробы ліквідацыі ісламу з палітычнага жыцця прывялі да такой мадэлі дзяржавы, пры якой рэлігія фармальна адсутнічае як кампанент і ў той жа час рэальна ўплывае на палітычнае жыццё. Ідэя стварэння Другой рэспублікі на аснове лібералізму і дэмакратыі, на думку палітыкаў праісламскай арыентацыі, дазволіць стварыць Асманскую дзяржаву.

У палітычным лексіконе сучаснай Турцыі часта выкарыстоўваюцца такія дэтэрмінатывы, як мусульмане-лібералы і мусульмане-дэмакраты, для характарыстыкі прыхільнікаў праісламскіх партый.

Сучасная палітычная сітуацыя характэрна тым, што кааліцыі палітычных партый на чале з Партыяй справядлівасці імкнуцца ўмацаваць свае пазіцыі і вылучыць свайго прэтэндэнта на пост прэзідэнта краіны. Аднак, наткнуўшыся на супраціўленне апазіцыйных партый, кааліцыя прапанавала законапраект аб выбранні прэзідэнта ўсенародна. Сумятня вакол паста прэзідэнта справакавала шматлікія маніфестацыі грамадскасці, занепакоенай актывізацыяй ісламісцкіх сіл.

Многія аналітыкі ў гэтай сувязі прагназіравалі ўмяшальніцтва арміі ў палітычнае жыццё. На наш погляд, такое ўмяшальніцтва магчыма, але і грамадскі фактар рэакцыі грамадскасці дазваляе зрабіць вывад, што ў краіне ўсталявалася палітычная раўнавага. Гэта раўнавага палітычных сіл дазволіць стварыць такую мадэль палітычнай сістэмы, у структуры якой дзяржава і рэлігійныя арганізацыі будуць мець вартыя іх месцы.

Літаратура

1. *Ucok, Bavriye.* Ataturkun izinde bir Arpa Boyu / Bavriye Ucok. – Ankara, 1985. – S. 85.
2. *Шахинлер, Ментер.* Кемализм: зарождение, влияние, актуальность / Ментер Шахинлер. – М., 1998. – С. 243, 247.
3. *Zaoust Henri.* Le chalifat dans la doctrine de Rashid Rida / Henri Zaoust. – Paris, 1965. – P. 125.
4. *Yalcin, Soner.* Hangi Erbakan? Basak yainlari / Soner Yalcin. – Ankara, 1994. – S. 115.
5. *Alain, Louyot.* La Turque laique malgre tout / Louyot Alain // «L' Expresse» du 29 awril 5 nai 1994.

Summary

*Stand out the principles of the failure modernized project. It is done motivation that present model mundane state presents itself syntheses of the religions and national factor.*

---

*УДК 324 (430)*

***Н.Дз. Пінчук,***
***аспірант кафедры паліталогіі БДУ***

# ЕЎРАПЕЙСКАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ФРГ ЯК ВЫРАЖЭННЕ ГЕРМАНСКІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

***Уводзіны.*** Навуковае абмеркаванне нацыянальных інтарэсаў і знешняй палітыкі ў Германіі ўяўляецца даволі палітызаваным і ў значнай ступені ідэалагізаваным [1, с. 114–121]. Часткова гэта тлумачыцца тым, што навука, якая займаецца знешняй палітыкай, мае справу з тэарэтычнымі паняццямі, якія засноўваюцца на светапоглядных перадумовах.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў Германія дакладана фармулявала свае нацыянальныя інтарэсы і паспяхова іх здзяйсняла. Зыходным тэарэтычным пунктам і аналітычнымі рамкамі катэгорыі «нацыянальныя інтарэсы» з'яўляюцца ўсталяваныя ў грамадстве, фармулюемыя партыямі і прызнаваемыя асноўнымі палітычнымі элітамі сапраўднымі на доўгатэрміновы перыяд, а таксама канкрэтызуемыя адпаведнымі ўрадамі ў Боне і Берліне мэтавыя ўстаноўкі палітыкі Германіі за мяжой.

На думку нямецкіх паліголагаў, спецыфіка Германіі заключаецца ў тым, што яна затрачвае на будаўніцтва Еўропы значна больш палітычнай энергіі, чым на рашэнне пытання аб тым, як забяспечыць уласнай дзяржаве і яе грамадзянам максімальна выгаднае месца ў Еўрапейскім саюзе (ЕС). У сучаснай германскай знешняй палітыцы наспела праблема, як без шкоды для добрага еўрапеізму захаваць ідэнтычнасць Германіі, да якой адносіцца таксама аптымальная палітычная і міжнародна-прававая свабода

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ